БУДУЧЫНЯ — У ЛІЧБЕ

Аляксандр Лукашэнка наведаў адзін з аб'ектаў урадавай сувязі КДБ

Прэзідэнту далажылі аб ажыццяўленні дзяржаўных праграм у сферы ўрадавай сувязі, перспектывах развіцця галіны, распрацоўцы сістэм рухомай урадавай радыёсувязі. Кіраўніку краіны прадэманстравалі ўзоры тэхнікі спецыяльнай сувязі, створанай беларускімі прадпрыемствамі, лінейку сродкаў сувязі і апаратуры шыфравання, у тым ліку абароненай мабільнай тэлефоннай сувязі.

У выніку рэалізацыі праграм адбыўся пераход ад аналагавага да лічбавага абсталявання. Распрацоўка і ўвод у карыстанне айчыннай тэхнікі і апаратуры шыфравання забяспечылі імпартазамяшчэнне.

Абароненасць, якасць і надзейнасць — галоўныя крытэрыі ў мадэрнізацыі ўрадавай сувязі.

Таксама кіраўніку дзяржавы паказалі рухомы комплекс тэхнічнага кіравання контртэрарыстычнай аперацыяй. Устаноўка, якая цяпер праходзіць дзяржаўныя выпрабаванні, здольная запускаць дроны, выяўляць і нейтралізаваць беспілотнікі.

«Гэта будучыня. Канешне, мы развіццё ўсяляк падтрымліваем. На гэта грошай шкадаваць не трэба, я цвёрда перакананы. Але пасля таго як альтэрнатыўныя падраздзяленні мне дакладуць, што вы сапраўды эфектыўныя, вычарпалі ўсякія рэзервы і вам патрэбна дапамога», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Акцэнт, на думку лідара краіны, неабходна зрабіць на распрацоўцы якаснага і надзейнага прадукту.

«Не можаце — не рабіце. Доўга вам яго трэба рабіць — рабіце спакойна. Але не бярыцеся за тое, што не можаце. Патрэбна будзе падтрымка — вы заўсёды яе атрымаеце, але не рабіце дрэннага прадукту», — цытуе словы Прэзідэнта БелТА.

Прыёмная кампанія

Моладзь выбірае IT

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі набраў сёлета рэкордную колькасць першакурснікаў. Па словах рэктара БДУІР Вадзіма БОГУША, на ўсе формы атрымання адукацыі першай ступені было залічана больш за 3,5 тысячы чалавек.

— Гэта адэкватны адказ на тыя выклікі і запыты, якія ёсць з боку нашых заказчыкаў кадраў, — падкрэсліў Вадзім Богуш. — Хачу адзначыць, што толькі за апошнія два гады мы амаль на 600 чалавек павялічылі аб'ёмы падрыхтоўкі. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў сёлета два чалавекі на месца.

Верхняя мяжа прахадных балаў сур'ёзна не змянілася. Напрыклад, на такую традыцыйна папулярную ў моладзі спецыяльнасць, як «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій», прахадны бал на бюджэт быў 360, а на платную форму трэба было набраць 309 балаў. «Гэта сведчыць пра тое, што ў нашу ВНУ прыходзіць вельмі моцны кантынгент выпускнікоў, якія здольныя асвойваць інтэнсіўныя і складаныя навучальныя праграмы», — адзначыў Вадзім Богуш.

Сярэдні бал абітурыентаў, якія паступілі на дзённую бюджэтную форму навучання, склаў 349, што на дзесяць балаў больш, чым у 2018-м. Пры гэтым сярэдні бал залічаных на платную форму — 282. Кожны шосты ўладальнік стабальнага сертыфіката падаў свае дакументы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Пры гэтым большасць уладальнікаў стабальных вынікаў набралі максімальную «сотню» па матэматыцы, якая з'яўляецца профільнай дысцыплінай для IT-спецыяльнасцяў.

БДУІР вядзе падрыхтоўку па 30 спецыяльнасцях на першай ступені, змест якіх штогод абнаўляецца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АГУЛЬНАЙ ПРАСТОРЫ — АДЗІНЫЯ РЫНКІ

Работу па стварэнні роўных умоў гаспадарання на агульнай прасторы ЕАЭС неабходна працягваць

Пра гэта на пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета ў Чалпон-Аце (Кыргызстан) заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас. На яго думку, адпаведная работа ў гэтым кірунку ўжо вядзецца, і ўдзельнікі Саюза вучацца прымаць рашэнні нацыянальнага ўзроўню з аглядкай на абавязацельствы ў ЕАЭС.

У той жа час яшчэ выклікаюць складанасці пытанні па асаблівасцях работы на рынках краін Саюза, доступе да дзяржзакупак, спецыфіцы субсідзіравання нацыянальных вытворцаў, арганізацыі транзіту, мытна-тарыфных мерах і іншыя.

У сакавіку гэтага года ўступіла ў сілу Пагадненне аб маркіроўцы тавараў сродкамі ідэнтыфікацыі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, але іх укараненне не павінна стаць яшчэ адным інструментам стрымлівання ўнутранага гандлю. Беларускі бок лічыць, што найбольшы эфект ад рэалізацыі пагаднення будзе дасягнуты пры ўдзеле ў працэсе ідэнтыфікацыі таварных патокаў усіх дзяржаў-членаў.

Найбольш важная задача для Саюза сёння — пераход да ўзгодненай, а ў будучыні і да адзінай прамысловай, аграпрамысловай палітыкі.

«Супрацоўніцтва ў прамысловасці і АПК дазволіць выйсці на новыя інавацыйныя праекты ў Еўразійскім эканамічным саюзе, значна нарасціць аб'ёмы выпуску канкурэнтнай высокатэхналагічнай прадукцыі, спрыяюць рэалізацыі праграм імпартазамяшчэння», — сказаў Сяргей Румас.

Трэба працягнуць работу над фарміраваннем агульных рынкаў ЕАЭС — энергетычнага, транспартнага, фінансавага.

Учора на палях саміта адбылася сустрэча беларускага прэм'ер-міністра з яго расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым. З беларускага боку ў сустрэчы таксама ўдзельнічалі віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка, міністр эканомікі Дзмітрый Крутой, першы намеснік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка, намеснік міністра фінансаў Дзмітрый Кійко.

Наступнае пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета пройдзе ў Маскве ў кастрычніку.

Паводле БелТА.

Выбары-2019

ПА ІНФАРМАЦЫЮ — НА САЙТ

Асноўныя вехі выбарчай кампаніі асвятляюцца ў інтэрнэце

Аднавіў дзейнасць спецыяльны інфармацыйны рэсурс Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў «Выбары-2019», дзе будуць асвятляцца ўсе найважнейшыя падзеі кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання.

На працягу трох месяцаў **старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА** будзе інфармаваць выбаршчыкаў аб галоўных падзеях, што адбыліся ў выбарчай кампаніі. Так, у першым сваім відэазвароце Лідзія Ярмошына паведаміла, што палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы і грамадзяне маюць права падаваць дакументы аб вылучэнні сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій да 30 жніўня ўключна.

ГАЛАСАВАННЕ Ў ПЫТАННЯХ І АДКАЗАХ

Вывучаем інфармацыю на сайце Цэнтрвыбаркама, каб разабрацца ў палітычных падзеях, што маюць адбыцца ўвосень. Даём адказы на распаўсюджаныя пытанні чытачоў.

— Выбары прызначаныя на 7 і 17 лістапада. Гэта значыць, што мне трэба будзе двойчы прыходзіць на выбарчы ўчастак?

Не, толькі 17 лістапада — прагаласаваць за кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, які выбіраецца непасрэдна грамадзянамі. А на 7 лістапада прызначаны выбары членаў Савета Рэспублікі — іх выбіраюць дэпутаты мясцовых Саветаў.

Прэзідыумы мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы з 9 верасня да 8 кастрычніка ўключна вылучаюць кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Мясцовыя Саветы выбіраюць 56 членаў — па 8 ад кожнай вобласці і Мінска, яшчэ 8 сенатараў прызначае кіраўнік дзяржавы. Пры правядзенні выбараў маюць права прысутнічаць назіральнікі. Выбраным лічыцца кандыдат у члены Савета Рэспублікі, які атрымаў больш за палову галасоў дэпутатаў, што прынялі ўдзел у галасаванні.

Пасяджэнне дэпутатаў мясцовых Саветаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі склікаецца не пазней за 35 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Савета Рэспублікі. Устанаўленне вынікаў выбараў і рэгістрацыя выбраных членаў адбудуцца не пазней за 22 лістапада.

Кандыдатам у члены Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Беларусі, які дасягнуў узросту 30 гадоў і пражыў на тэрыторыі адпаведнай вобласці, Мінска не менш за пяць гадоў.

Кандыдатамі ў члены верхняй палаты не могуць быць вылучаныя грамадзяне, якія не маюць права займаць пасады ў дзяржаўных органах і іншых дзяржарганізацыях у сувязі з наяўнасцю судзімасці.

— Я — грамадзянін Беларусі. Ці магу я стаць парламентарыем?

Так. Калі вам споўніўся 21 год, вы стала пражываеце на тэрыторыі рэспублікі і не маеце судзімасці, вы можаце балатавацца ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, у складзе якой — 110 дэпутатаў.

Кандыдат у дэпутаты ніжняй палаты парламента можа быць вылучаны палітычнай партыяй, працоўным калектывам альбо грамадзянамі шляхам збору подпісаў. Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пройдзе з 8 верасня да 7 кастрычніка ўключна, рэгістрацыя кандыдатаў — з 8 да 17 кастрычніка ўключна.

— У лістападзе я буду ў камандзіроўцы за мяжой. Дык што, я не змагу прагаласаваць?

Зможаце. Па-першае, выбарчае заканадаўства прадугледжвае датэрміновае галасаванне на працягу пяці дзён да выбараў, а таксама галасаванне па месцы знаходжання (санаторыі, дамы адпачынку, бальніцы, воінскія часці і іншае) грамадзян, якія па ўважлівых прычынах не змогуць у дзень выбараў прыйсці ў памяшканне для галасавання. Па-другое, калі вы за мяжой, можна прагаласаваць на ўчастку, які ўтвораны дыпламатычным прадстаўніцтвам Беларусі.

На ўчастку для галасавання, утвораным за межамі Беларусі, галасуюць грамадзяне краіны, якія пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы ці знаходзяцца ў працяглай камандзіроўцы, а таксама якія наведваюць замежную дзяржаву ў сувязі з прыватнай, службовай, дзелавой ці турыстычнай паездкай. Так, на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў папярэдняга, шостага, склікання дзейнічала 47 участкаў за межамі Беларусі.

Варвара МАРОЗАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Мінсельгас Расіі не падтрымаў ідэю забараніць знішчэнне санкцыйных прадуктаў

Міністэрства сельскай гаспадаркі РФ не падтрымала ідэю ўвесці забарону на знішчэнне забароненых да ўвозу прадуктаў, падкрэсліўшы, што яе рэалізацыя можа спрыяць пашырэнню нелегальнага абароту.

Гэта вынікае з адказу ведамства на запыт камітэта Дзярждумы па эканамічнай палітыцы «Аб магчымасці ўвядзення забароны на знішчэнне прыдатных да ўжывання прадуктаў», накіраваны пасля пратакольнага даручэння ніжняй палаты парламента.

У лісце намесніка кіраўніка Мінсельгаса Аксаны Лут гаворыцца, што ўвядзенне забароны на знішчэнне «можа стварыць дадатковыя ўмовы для нелегальнага абароту забароненых да ўвозу тавараў, у тым ліку і такіх, што ўяўляюць патэнцыйную небяспеку ў сувязі з парушэннем правілаў увозу тавараў». Акрамя таго, Лут адзначыла, што ў адпаведнасці з заканадаўствам РФ «спецыяльныя эканамічныя меры носяць часовы характар, а канкрэтныя дзеянні ў рамках спецыяльных эканамічных мер могуць мяняцца ў адпаведнасці з тым, як развіваецца знешняе эканамічнае і палітычнае становішча». У сувязі з гэтым «Мінсельгас Расіі ў дачыненні да забароненай да ўвозу прадукцыі прытрымліваецца пазіцыі па знішчэнні такой прадукцыі», падкрэсліваецца ў лісце.

Становішча на вуліцах Бішкека пасля начных беспарадкаў нармалізавалася

Жыццё ў сталіцы Кыргызстана вярнулася ў ранейшае рэчышча пасля начных беспарадкаў з удзелам прыхільнікаў затрыманага ў чацвер экс-прэзідэнта Алмазбека Атамбаева. На галоўнай плошчы Ала-Тоа і прылеглых да яе вуліцах абстаноўка спакойная, перадае ў пятніцу з Бішкека карэспандэнт ТАСС.

Ужо раніцай у пятніцу ў цэнтры Бішкека з цяжкасцю можна было выявіць сляды начных беспарадкаў, учыненых групай агрэсіўна настроеных маладых людзей, якія выйшлі на плошчу Ала-Тоа, пасля таго як даведаліся пра затрыманне былога кіраўніка дзяржавы.

Тым часам стала вядома, што былы кандыдат у прэзідэнты Кіргізіі Амурбек Бабанаў вярнуўся ў пятніцу ў сталіцу рэспублікі, дзе супраць яго распачатая крымінальная справа. Раней Дзяржаўны камітэт нацыянальнай бяспекі распаўсюдзіў паведамленне аб тым, што Бабанаў у выпадку вяртання на радзіму абавязкова будзе затрыманы.

Амурбек Бабанаў з'яўляецца заснавальнікам і лідарам папулярнай у краіне партыі «Рэспубліка». У 2017 годзе ён балатаваўся ў прэзідэнты і заняў другое месца, набраўшы каля 34 % галасоў. Ён прапусціў наперад толькі цяперашняга кіраўніка дзяржавы Сааранбая Жээнбекава, за якога прагаласавала крыху больш за палову выбаршчыкаў.

Праз некалькі дзён пасля выбараў палітык вымушаны быў з'ехаць з Кыргызстана, бо ў дачыненні да яго была ўзбуджаная крымінальная справа.

ФБР захацела таемна сачыць за карыстальнікамі сацсетак

Федэральнае бюро расследаванняў ЗША шукае прыватныя кампаніі-падрадчыкі, якія змогуць збіраць і перадаваць у праваахоўныя органы велізарныя аб'ёмы даных карыстальнікаў такіх сацыяльных сетак, як Twitter, Facebook і Instagram. Пра гэта гаворыцца ў заяўцы на правядзенне тэндара, паведамляе CNN.

Адзначаецца, што пошукам ФБР занялося яшчэ ў ліпені. У дакуменце ўказваецца, што амерыканскі ўрад мае патрэбу ў «доступе да ўсяго абмену даных у сацыяльных сетках у рэальным часе», каб лепш змагацца з тэрарыстамі і ўнутранымі пагрозамі.

Для гэтага бюро шукае правайдараў, якія будуць загадзя папярэджваць праваахоўныя органы аб падрыхтоўцы магчымых інцыдэнтаў з прымяненнем насілля, а таксама пры неабходнасці змогуць раскрыць ідэнтыфікацыйныя нумары карыстальнікаў у сацыяльных сетках, іх IP-адрасы і нумары тэлефонаў.